# Пятро Магіла ў Супрасьлі

Навукоўцы з Польшчы, Канады, Расеі, Украіны сустрэліся на канфэрэнцыі “Пятро Магіла і праваслаўная культура ягонай эпохі”, якая адбылася ў будынках Супраскага манастыра 6—7 чэрвеня 1997 г. Гэта быў ужо трэці сэмінар з цыклю “Супраская лаўра”, які арганізоўваецца Брацтвам сьв.сьв. Кірылы і Мятода з 1995 году. Паважнасьці нарадам надала прысутнасьць Яго Праасьвяшчэнства архіяпіскапа прафэсара Савы, які ня толькі выступіў з уступным дакладам пра Пятра Магілу, але знайшоў таксама час спаткацца з удзельнікамі сэмінару пры вогнішчы.

Плён сёлетняй сустрэчы вельмі багаты. Жыцьцё і дзейнасьць мітрапаліта ды ягоная эпоха асьвятляліся ня толькі з праваслаўнага боку, але і з пункту гледжаньня навукоўцаў, якія цікавяцца праблемай з чыста дасьледчыцкіх пазыцыяў.

Аказваецца, супярэчнымі зьяўляюцца нават такія агульнапрынятыя факты з жыцьця заснавальніка Кіева–Магілянскай акадэміі (пра яе гаварыла прафэсар Тэрэса Хынчэўская–Гэнэль з Варшавы), як дата ягонага нараджэньня. Дагэтуль прынята, што Пятро Магіла нарадзіўся ў 1596 г. А вось прафэсар Марыян Бэндза з Варшавы стаў даказваць, што герой канфэрэнцыі нарадзіўся ажно на 22 гады раней, у 1574 г. Асновай доказаў прафэсара Бэндзы паслужылі новазнойдзеныя інскрыпцыі, дзе падаецца прыведзеная ім дата. Да таго ж, калі прыняць ранейшую дату нараджэньня, больш зразумелым становіцца, калі будучы мітрапаліт пасьпеў прайсьці навучаньне ў езуітаў у Францыі ды стаць настолькі дасьведчаным вайскоўцам, каб камандаваць казацкай часткай у час Хацінскай вайны.

Асаблівае ўражаньне пакінула выступленьне доктара Паўла Зёла з Канады пра расчытваньне помнікаў музычнай палеаграфіі. Дасьледчык, сын паляка і ангелькі, так апантана паглыбіўся ў вывучэньне даўніны царкоўнай музыкі, што прыняў праваслаўе і вядзе ансамбаль старадаўняй царкоўнай музыкі. Ён заахвочваў, каб і тутэйшыя аматары сьпеву стварылі падобны хор.

Калі ўлічыць, што ёсьць у нас і гістарычная спадчына (напрыклад, Супраскі ермалай, пра які гаварыў прафэсар Юры Ясіноўскі са Львова) і музычныя сілы, застаецца прычакаць, хто падхопіць заклік канадзкага навукоўца.

На жаль, не было на канфэрэнцыі гасьцей зь Беларусі, але гонар замежных беларусаў абараняў доктар Мікола Нікалаеў з Санкт–Пецярбургу, які выступіў з дакладам “Літаратурныя рукапісныя кнігі ў Вялікім Княстве Літоўскім”.

Дзейным арганізатарам канфэрэнцыі быў доктар Антон Мірановіч, які, апрача таго, што наглядаў за ўсім мерапрыемствам, выступіў з дакладам пра беларускага япіскапа Феадосія Васілевіча.

Гасьцінным гаспадаром аказаўся ігумен Супраскай лаўры айцец архімандрыт Мірон. Дзякуючы яму ўдзельнікі сэмінару спажывалі ня толькі духоўную страву, але і смачна абедалі ў манастырскай трапезнай.

Шкада толькі, што такі ўдалы сэмінар прайшоў пры нешматлікай публіцы. Што ж, публіку таксама трэба арганізаваць. Супрасьль не за гарамі, але ж патэнцыйная публіка жыве ў Беластоку. Брацтва сьв.сьв. Кірылы і Мятода павінна ўлічыць гэты факт, рыхтуючы наступную канфэрэнцыю з цыклю “Супраская лаўра”.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1997. 22 чэрвеня. № 25. С. 5.